# Што прапануюць распрацоўшчыкі і што цікава інвестарам?

Студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя робататэхнікі БрДТУ займаецца распрацоўкай робатаў. Тут з'явіўся, напрыклад, робат-ахоўнік. На падыходзе яшчэ адзін цікавы праект — робат-гід, якога маладыя вучоныя і студэнты плануюць стварыць да чэмпіянату свету па хакеі, што пройдзе ў Беларусі ў 2014 годзе. З гэтай і многімі іншымі распрацоўкамі ўніверсітэтаў можна было азнаёміцца падчас выставы, якая прайшла ў межах Беларускага інавацыйнага тыдня ў Нацыянальнай бібліятэцы. На жаль, прадстаўнікоў інвестыцыйных кампаній і венчурных фондаў, якія ўзялі ўдзел у адкрыцці Маладзёжнага інавацыйнага форуму "Навука і бізнес-2011", цікавілі пераважна інфармацыйныя тэхналогіі: інтэрнэт і воблачныя вылічэнні, ...ільныя дадаткі.

**Распрацоўкі студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі робататэхнікі БрДТУ шырока вядомыя ў краіне: яны "раскручаны" ў СМІ, заўсёды выстаўляюцца на разнастайных выставах навукова-тэхнічных дасягненняў. У лабараторыі займаюцца распрацоўкай робатаў. Пачыналі з простых, паступова адпрацоўвалі тэхналогіі, павышалі свой узровень. Так з'явіўся, напрыклад, робат-ахоўнік, які можа прымяняцца як для выяўлення несанкцыянаваных "гасцей", так і для выяўлення пажараў, папярэджання хімічнай бяспекі. На падыходзе яшчэ адзін цікавы праект — робат-гід.**




# Што прапаноўваюць распрацоўшчыкі і што цікава інвестарам?

"Аналагі такіх робатаў ёсць у свеце, але мы хочам стварыць свайго, беларускага, робата. Плануем скончыць працу да 2014 года, каб робат быў карысным для замежных турыстаў, якія прыедуць у нашу краіну на чэмпіянат свету па хакеі", — расказаў адзін з распрацоўшчыкаў аспірант кафедры "Інтэлектуальныя інфармацыйныя тэхналогіі" БрДТУ Іван Дунец. Мультымоўны робат-гід будзе рухацца ў даволі шчыльным натоўпе, не сутыкаючыся з людзьмі, і выдаваць інтэрактыўную інфармацыю аб Мінску, гасцініцах, рэстаранах і г.д. Магчыма, першы доследны ўзор, калі ўсё складзецца ўдала, будзе прадэманстраваны на выставе ТІБО-2012. "Канечне, вельмі хутка мы не зможам нагнаць лепшыя распрацоўкі, якія існуюць у Японіі, Германіі, ЗША — лідарах у галіне робататэхнікі. Але такая мэта ў нас ёсць. Магчыма, гадоў праз пяць у нас гэта атрымаецца", — гаворыць аспірант.

"Шматмэтавая мабільная робатызаваная платформа" (менавіта так называецца расцоўка Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта) нядаўна была прадстаўлена на выставе інавацыйных распрацовак і інвестыцыйных праектаў у Нацыянальнай бібліятэцы ў межах Беларускага інавацыйнага тыдня. З экспазіцыямі універсітэтаў маглі азнаёміцца прадстаўнікі інвестыцыйных кампаній і венчурных фондаў, якія ўзялі ўдзел у адкрыцці Маладзёжнага інавацыйнага форуму "Навука і бізнес-2011". Вось толькі цікавілі іх пераважна інфармацыйныя тэхналогіі: інтэрнэт і воблачныя вылічэнні, мабільныя дадаткі. Затое інвестары-спікеры далі шмат вельмі каштоўных парад маладым стартаперам ці патэнцыяльным бізнесменам, якія плануюць рэалізоўваць уласныя высокатэхналагічныя праекты. Хочацца спадзявацца, што ў нешматлюднай аўдыторыі былі сапраўды зацікаўленыя слухачы.

Паводле слоў Руперта Марча, дырэктара дэпартамента развіцця карпарацыі Microsoft, зараз усё больш IT-кампаній, у тым ліку і маладых, распрацоўваюць інавацыйныя праекты, звязаныя з воблачнымі рашэннямі. "Калі вы хочаце пачаць свой бізнес, падумайце над тым, якім чынам людзі хацелі б выкарыстоўваць камп'ютар. Іншымі словамі, ідзіце ад патрэб карыстальнікаў, — зазначыў спікер. — Той, хто лічыць, што крызіс — не лепшы час для адкрыцця ўласнай справы, памыляецца. Калі паглядзець на сусветна вядомыя брэнды, напрыклад, Apple, HP, то многія з іх бяруць пачатак менавіта ў перыяд рэцэсіі. У складаныя перыяды ўзнікаюць новыя магчымасці. Верагодна таму, што старыя кампаніі становяцца больш слабымі і страчваюць свае пазіцыі". Руперт Марч упэўнены, што ўзрост чалавека не мае адносін да патэнцыяльнага поспеху ў стварэнні і развіцці ўласнага бізнесу. Поспех — гэта вынік пастаяннага навучання, набыцця вопыту, аналізу памылак, вельмі карпатлівай працы, і прыходзіць ён, па вопыце буйных бізнесменаў, не раней чым пасля двух паражэнняў. Спадар Марч паведаміў, што Microsoft рэалізоўвае праграму падтрымкі кампаній-стартапаў, якія займаюцца распрацоўкай праграмнага забеспячэння, у якой удзельнічаюць ужо каля 45 тысяч стартапаў пераважна з Усходняй Еўропы. Праграма адкрыта і для беларусаў.

Кіруючы партнёр міжнароднага інвестыцыйнага фонду Runa Capital Дзмітрый Чыхачоў зазначыў, што "інвестар — гэта не толькі фінансаванне, не менш значная і магчымасць скарыстаць яго вопыт". Акрамя таго, наяўнасць прафесійнага інвестара павышае "вагу" кампаніі ў вачах кліентаў, партнёраў, супрацоўнікаў. Інвестар звяртае ўвагу на тры рэчы: каманду, тэхналогію (ці прадукт), якую яна прапаноўвае, і рыначны магчымасці. Па вопыце фонду, які прадстаўляе Дзмітрый Чыхачоў, інвестыцыі атрымліваюць усяго каля 3% стартапаў. Па ацэнцы спікера, у найбліжэйшай будучыні будуць найбольш актуальнымі наступныя трэнды, у якія фонд і імкнецца інвесціраваць: мабільны інтэрнэт, сацыяльныя сеткі, воблачныя вылічэнні. Развіццё "аблокаў" зробіць інфармацыйныя тэхналогіі больш даступнымі для малога бізнесу, паколькі воблачныя рашэнні маюць на ўвазе непасрэдна інтэрнэт-сэрвісы і выключаюць выдаткі на інфраструктуру і яе адміністраванне. Гэта проста неабсяжны рынак. "Зараз мы назіраем радыкальныя змены ландшафту IT-індустрыі, а ў перыяд перамен новаму бізнесу значна лягчэй знайсці сваё месца, чым у перыяд стабільнасці, — заўважыў Д.Чыхачоў. — Таму тым, хто задумваецца аб стварэнні стартапаў, раю звярнуць увагу на гэтыя тэндэнцыі".

Яшчэ адзін госць Маладзёжнага інавацыйнага форуму прадстаўнік мабільнага аператара Velcom Станімір Мінаў прадказаў... смарт-рэвалюцыю. Па яго прагнозе, у 2014 годзе кожны другі беларус будзе карыстацца смартфонам, у тым ліку і для доступу ў інтэрнэт. "Смартфоны валодаюць вялізным патэнцыялам, таму што істотна спрашчаюць наша жыццё, — лічыць С.Мінаў. — Смартфон хутка заменіць пластыкавыя карткі і ваш кашалёк, ён будзе выконваць ролю дыстанцыйнага кіравання вашага тэлевізара, ён стане вашым гідам у горадзе, не кажучы аб усіх перавагах мабільнага інтэрнэту. Ужо зараз 20% запытаў у пошукавіку Google пачынаюцца са слова "смартфон", і гэтая лічба будзе расці". Словам, смартфоны будуць станавіцца ўсё больш разумнымі, і гэта яшчэ адзін трэнд для высокатэхналагічнага бізнесу ў посткамп'ютарны перыяд. Паводле выступоўцы, смартфоны ўжо пачынаюць выцясняць камп'ютары.


**Іна НІКІЦЕНКА.**
*nikitsenka@nastgaz.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**